ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

№ 8 (644) | Аўторак, 10 сакавіка 1987 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

*Расказвае дэлегат з'езда прафсаюзаў*

## ДАКЛАДНАЯ ПРАГРАМА

XVIII з'езд прафсаюзаў СССР стаў значнай падзеяй у маім жыцці. Я ўпершыню прымала ўдзел у такім прадстаўнічым форуме. Хачу падзяліцца сваімі ўражаннямі аб рабоце з'езда.

Перш за ўсё хацелася б сказаць аб той дзелавой атмасферы, якая панавала ў час работы з'езда. Яна была напоўнена духам часу, пошукам канкрэтных шляхоў рашэння новых задач. Ён праходзіў у абстаноўцы крытычнай, прынцыповай ацэнкі дзейнасці прафсаюзаў, канкрэтнасці і дзелавітасці ў вызначэнні задач на будучае. Такі настрой рабоце з'езда надалі рашэнні XXVII з'езда КПСС, студзеньскага (1987 г.) Пленума ЦК КПСС.

Вялікае ўражанне на нас, дэлегатаў, зрабіла прамова Генеральнага сакратара ЦК КПСС М. С. Гарбачова. Ён указаў на першачарговыя задачы прафсаюзаў, вызначыў іх ролю ва ўмовах перабудовы. Прамова М. С. Гарбачова была прасякнута вялікімі клопатамі аб тым, каб прафесіянальныя саюзы былі ў першых радах перабудовы, не адставалі ад тых пераўтварэнняў, якія ідуць у нашай краіне, займалі ў грамадстве актыўную пазіцыю, цвёрда праводзілі ў жыццё лінію на абарону інтарэсаў працоўных.

Патрабавальна і самакрытычна аналізавалася на з'ездзе дзейнасць прафсаюзных органаў. Многія дэлегаты ў сваіх выступленнях гаварылі аб неабходнасці павышаць баявітасць прафсаюзных арганізацый, смялей развіваць дэмакратыю. Выказвалася думка аб тым, што ва ўмовах перабудовы прафсаюзы абавязаны больш актыўна дапамагаць працоўным калектывам ва ўкараненні перадавой тэхнікі і прагрэсіўных тэхналогій, у барацьбе за павышэнне якасці прадукцыі, эканомію сыравіны, матэрыялаў, захаванне працоўнай дысцыпліны.

З'езд падкрэсліў першачарговую важнасць работы прафсаюзаў па ўмацаванню здароўя працоўных, прафілактыцы захворванняў і зніжэнню на гэтай аснове страт рабочага часу. З адабрэннем аднесліся дэлегаты да выказаных на з'ездзе прапаноў аб паскарэнні тэмпаў санаторна-курортнага будаўніцтва, павелічэнні колькасці спецыялізаваных санаторыяў для маці і дзіцяці, аб пашырэнні магчымасцей для сямейнага адпачынку.

Закранулі дэлегаты і пытанні ўдзелу прафсаюзных арганізацый у стварэнні і развіцці адзінай сістэмы няспыннай адукацыі, правядзенні рэформы агульнаадукацыйнай і прафесіянальнай школы, перабудове вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, паляпшэнні падрыхтоўкі моладзі да самастойнага жыцця і працы. Прафсаюзам, адзначалі дэлегаты, трэба праяўляць больш клопатаў аб умацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы вытворчай практыкі, развіцці сеткі вучэбных цэхаў, участкаў, лабараторый, вопытных гаспадарак, забеспячэнні камп'ютэрнай пісьменнасці навучэнцаў і студэнтаў.

Шмат увагі ўдзялялася на з'ездзе пытанням сацыялістычнага спаборніцтва. Дэлегаты прама і адкрыта гаварылі аб недахопах у гэтай вельмі важнай справе і прапанавалі настойліва пазбаўляцца ад фармалізму, паказухі, заарганізаванасці, устарэлых метадаў, аджыўшых прыёмаў працоўнага саперніцтва. Галоўная задача сацыялістычнага спаборніцтва сёння, як адзначалася на з'ездзе, — гэта развіццё творчасці, ініцыятывы, розуму, таленту, асваення перадавога вопыту.

Горача абмяркоўвалі на з'ездзе пытанні жыллёвага будаўніцтва, паляпшэння ўмоў быту працоўных, удасканальвання аплаты працы.

На з'ездзе ўздымаліся і многія іншыя пытанні. Дэлегаты абмяркоўвалі іх па-дзелавому, з верай у поспех.

У дні работы з'езда для дэлегатаў былі арганізаваны сустрэчы з працоўнымі сталіцы, артыстамі кіно і тэатраў, савецкімі пісьменнікамі і паэтамі. Мы пабывалі на выстаўках сталіцы, на спартыўных арэнах, былі гасцямі Палаца піянераў.

Дзелавы настрой XVIII з'езда прафсаюзаў настройвае мяне, яго дэлегата, а таксама ўсіх савецкіх людзей на паспяховае ажыццяўленне прынятых на ім рашэнняў.

**В. ГОРЛЕНКА,**
дацэнт кафедры педагогікі і псіхалогіі, дэлегат XVIII з'езда прафсаюзаў СССР.



НА ЗДЫМКУ: у час работы XVIII з'езда прафсаюзаў СССР. Крайняя злева — дацэнт кафедры педагогікі і псіхалогіі ГДУ В. П. Горленка.

## XXVIII з'езд ЛКСМ Беларусі

5—6 сакавіка ў Мінску праходзіў XXVIII з'езд Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі Беларусі. У яго радах амаль паўтара мільёна юнакоў і дзяўчат. Лепшыя прадстаўнікі рабочай, калгаснай і студэнцкай моладзі, тэхнічнай інтэлігенцыі, работнікі культуры і мастацтва, воіны Савецкай Арміі вялі патрабавальную размову аб сваім месцы ў вырашэнні канкрэтных народнагаспадарчых задач, аб удзеле камітэтаў камсамола і пярвічных арганізацый у кіраванні вытворчасцю, камуністычным выхаванні адзінай моладзі, аб шляхах дэмакратызацыі камсамольскага жыцця.

У прэзідыуме з'езда былі таварышы Я. Я. Сакалоў, Г. С. Таразевіч, М. В. Кавалёў, члены і кандыдаты ў члены Бюро ЦК КПБ, сакратар ЦК ВЛКСМ М. І. Пальцаў, лётчык-касманаўт, двойчы Герой Савецкага Саюза У. В. Кавалёнак сакратары ЦК ЛКСМБ, маладыя перадавікі вытворчасці. У рабоце з'езда ўдзельнічала дэлегацыя Саюза сацыялістычнай моладзі Харватыі, а таксама прадстаўнікі камсамольскіх арганізацый двойчы Чырвонасцяжнага Балтыйскага флоту, Групы савецкіх войск у Германіі, БАМа, БУ № 94 імя камсамола Беларусі трэста «Краснаярскэкскаватарцяжбуд».

З дакладам «Справаздача Цэнтральнага Камітэта ЛКСМ Беларусі і задачы камсамола рэспублікі па далейшаму ўзмацненню камуністычнага выхавання моладзі ў святле ўстановак XXVII з'езда КПСС» выступіў першы сакратар ЦК ЛКСМБ В. В. Гурын.

Са справаздачай Рэвізійнай камісіі ЛКСМБ выступіў яе старшыня А. Н. Разумаў.

Пасля дакладаў пачаліся спрэчкі.

У той жа дзень дэлегаты з'езда ўдзельнічалі ў рабоце дыскусійных цэнтраў, дзе абмяркоўваліся вострыя праблемы маладзёжнага жыцця, прысутнічалі на святочным канцэрце.

6 сакавіка на XXVIII з'ездзе ЛКСМБ працягвалася абмеркаванне справаздачных дакладаў ЦК і Рэвізійнай камісіі. Дэлегаты сканцэнтравалі ўвагу на актуальных праблемах жыцця моладзі, самакрытычна ацэньвалі зробленае. Ішла размова аб удзеле юнакоў і дзяўчат у паскарэнні сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, перабудове ў рабоце камітэтаў камсамола і пярвічных арганізацый, выхаванні моладзі ў духу высокай камуністычнай перакананасці, інтэрнацыяналізму, непрымірымасці да буржуазнай ідэалогіі. Дэлегаты ўносілі канкрэтныя прапановы па ўхіленню недахопаў у дзейнасці камсамольскіх арганізацый, калектыўна выпрацоўваючы праграму дзеянняў беларускага камсамола ў сучасных умовах.

Цёпла сустрэты прысутнымі, на з'ездзе выступіў першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі Я. Я. Сакалоў.

На з'ездзе выступілі таксама сакратар ЦК ВЛКСМ М. І. Пальцаў, з заключным словам — першы сакратар ЦК ЛКСМБ В. В. Гурын.

З'езд аднадушна прыняў рэзалюцыю па справаздачнаму дакладу ЦК ЛКСМБ і пастанову па справаздачы Рэвізійнай камісіі ЛКСМБ.

Выбраны новы састаў Цэнтральнага Камітэта Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі Беларусі і Рэвізійнай камісіі ЛКСМБ.

## Пленум ЦК ЛКСМБ

6 сакавіка адбыўся пленум Цэнтральнага Камітэта ЛКСМ Беларусі, выбранага XXVIII з'ездам. Разгледжаны арганізацыйныя пытанні.

Першым сакратаром ЦК ЛКСМБ выбран В. В. Гурын, сакратарамі — У. У. Кудлаш, Т. В. Граблеўская, С. М. Лабанаў, М. М. Самафалаў, М. В. Падгайны.

Зацверджаны загадчыкі аддзелаў ЦК ЛКСМБ, рэдактары маладзёжных газет і часопісаў.

У рабоце пленума прынялі ўдзел першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі Я. Я. Сакалоў, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Г. С. Таразевіч, Старшыня Савета Міністраў рэспублікі М. В. Кавалёў, члены Бюро ЦК КПБ, сакратар ЦК ВЛКСМ М. І. Пальцаў.

(БЕЛТА).

## Выбары прэзідыума АН БССР

Сесія агульнага сходу Акадэміі навук БССР, якая адбылася 3—4 сакавіка ў Мінску, выбрала новы састаў прэзідыума акадэміі.

Прэзідэнтам Акадэміі навук БССР выбран акадэмік АН БССР У. П. Платонаў. Віцэ-прэзідэнтамі акадэміі выбраны акадэмікі АН БССР І. І. Ліштван, І. Я. Навуменка, А. В. Сцепаненка, галоўным вучоным сакратаром прэзідыума АН БССР — акадэмік АН БССР А. М. Ганчарэнка, членамі прэзідыума АН БССР — акадэмікі АН БССР А. С. Дзмітрыеў, Л. І. Кісялеўскі і А. І. Свірыдзёнак.

Сесія агульнага сходу зацвердзіла акадэмікаў-сакратароў аддзяленняў навук, якія былі выбраны на агульных сходах аддзяленняў. Акадэмікамі-сакратарамі аддзяленняў выбраны акадэмікі АН БССР: фізікі, матэматыкі і інфарматыкі — У. А. Лабуноў, фізіка-тэхнічных праблем машынабудавання і энергетыкі — С. А. Астапчык, хімічных і геалагічных навук — У. С. Камароў, біялагічных навук — Л. М. Сушчэня, грамадскіх навук — М. В. Бірыла.

У рабоце сесіі агульнага сходу Акадэміі навук БССР прынялі ўдзел сакратар ЦК КПБ В. А. Пячэннікаў і віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук СССР акадэмік Я. П. Веліхаў.

(БЕЛТА).

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат матэматычнага факультэта, кафедра алгебры і геаметрыі горача віншуюць асістэнта гэтай кафедры ВАСІЛЬЕВА Аляксандра Фёдаравіча з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.

• • •

Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат гісторыка-філалагічнага факультэта, кафедра гісторыі СССР і БССР горача віншуюць асістэнта гэтай кафедры САМЕЙНЫХ Зою Мацвееўну з зацвярджэннем яе ВАКам у вучонай ступені кандыдата гістарычных навук.

*Партыйнае жыццё*

# АГУЛЬНАЙ СПРАВЕ — КАЛЕКТЫЎНЫ КЛОПАТ

**На чарговым адкрытым партыйным сходзе эканамічнага факультэта абмеркаваны задачы партарганізацыі эканомфака па павышэнню якасці ведаў студэнтаў і развіццю іх самакіравання.**

З дакладам выступіў намеснік дэкана факультэта М. В. Герасімчык. Ён усебакова прааналізаваў вынікі паспяховасці студэнтаў за мінулую зімовую залікова-экзаменацыйную сесію. Адзначана, што якасць ведаў студэнтаў яшчэ далёкая ад сучасных высокіх патрабаванняў. Гэта — вынік несур'ёзных адносін з боку многіх будучых спецыялістаў да вучобы, пропуску заняткаў без уважлівых прычын. У дакладзе шмат гаварылася і аб укараненні ў жыццё студэнцкага самакіравання, як таго патрабуе перабудова вышэйшай школы.

Абмяркоўваемае пытанне выклікала ажыўленыя, дзелавыя спрэчкі. Думкі выступаючых змяшчаюцца ніжэй.

**Я. Я. ВЯРШЫГАРА, дацэнт кафедры эканомікі працы:**

— Мне здаецца, што на працягу ўсіх гадоў існавання нашага факультэта на асобныя пытанні мы наогул не звяртаем увагі. Аснова ведаў — гэта лекцыя. Ад таго, як мы чытаем яе, у многім залежаць і поспехі студэнтаў. Аднак за ўвесь гэты час выкладчыкі наведвалі мае лекцыі толькі два разы. Пажадана, каб гэта рабілася значна часцей. Трэба зазначаць вартасці лекцыі, указваць на недахопы, пераймаць станоўчы вопыт. Лічу неабходным стварыць міжкафедральную камісію, якая б магла ў любы час наведаць лекцыю або практычныя заняткі.

Другая палавіна нашай работы — практычныя заняткі. На іх мы звычайна рашаем задачы. Але гэта ўжо ўстарэўшая форма. Пара больш мэтанакіравана вырашаць вытворчыя сітуацыі, праводзіць дзелавыя гульні. Мне пакуль што гэта не ўдалося і я з задавальненнем пераймаю вопыт у дацэнта Л. С. Лазучэнкавай.

**Б. КЛІМОВІЧ, старшыня Савета студэнцкага самакіравання факультэта:**

— Мы робім пакуль што першыя крокі. На сённяшні дзень асноўнае пытанне — размеркаванне стыпендыі. Аднак і тут па сваёй нявопытнасці дапусцілі промах. У групе Т-42, якая здала сесію без двоек, хацелі назначыць стыпендыю для ўсіх студэнтаў, але на паперы гэта не зафіксавалі. Таму наша задумка не ажыццявілася.

Лічу, што ўсе пытанні ў акадэмічных групах павінны вырашаць камсорг, прафорг і староста. На іх будзе абапірацца студэнцкае самакіраванне. Мы ўжо бачым праблемы, якія стаяць перад намі, — гэта наведванне заняткаў, паспяховасць, прывядзенне ў парадак нашага корпуса.

**У. Р. РАКАЎ, ст. выкладчык кафедры ТСАЭІ:**

— Цяпер шмат гаворыцца аб перабудове. Яе трэба пачынаць ва ўсіх звеннях нашага грамадства, і, перш за ўсё, і ў партарганізацыі. Мы ж ідзём па інерцыі і пакуль не перабудоўваемся. Пытанне стаіць аб задачах партарганізацыі, а з дакладам выступае намеснік дэкана. Ён не член партбюро.

Цяпер аб задачах, якія стаяць перад партыйнай арганізацыяй, калектывам факультэта. Неабходна палепшыць якасць правядзення лекцый ва ўмовах скарачэння лекцыйных гадзін. Адзіны шлях — прымяненне тэхнічных сродкаў навучання. Адна абсталяваная тэлеаўдыторыя і яе выкарыстанне ўжо дае вынікі. Напрыклад, з выкарыстаннем ТВ за адну лекцыю я маю магчымасць даць студэнтам ведаў на 30—40% больш. Трэба змяніць таксама свядомасць і псіхалогію студэнтаў у асваенні вывучаемых дысцыплін. Гэту работу мы павінны пачынаць з першага курса, прывучаць студэнтаў не да механічнага канспектавання лекцыі, а да асэнсавання і самастойнай работы. Да скарачэння колькасці лекцыйных гадзін па розных дысцыплінах трэба падыходзіць дэферэнцыравана.

**А. ЧАРНЯЎСКАЯ, старшыня ВВК факультэта:**

— Пракантраляваць наведванне заняткаў студэнтамі вельмі цяжка, таму што старасты не ставяць пропускі ў журналах. Дрэнна, што ВВК не можа самастойна прымаць рашэнні, знаходзіцца ў залежнасці ад камітэта камсамола. Трэба даваць ёй пэўныя правы.

**В. Е. ЦІШЧАНКА, загадчык кафедры аналізу гаспадарчай дзейнасці, прафесар:**

— Як уплывае перабудова ў вучэбным працэсе на вынікі работы кафедры? Цяжка зрабіць пераканаўчыя вывады — паспяховасць некалькі знізілася. Гэта тлумачыцца тым, што частка лекцый пераведзена на самастойнае вывучэнне. Мы механічна сціснулі лекцыйныя курсы па ўсіх прадметах. Цяпер стаіць самае сур'ёзнае пытанне — забеспячэнне студэнтаў вучэбна-метадычнай літаратурай.

**М. У. ІГНАТАВА, загадчыца лабараторыямі факультэта:**

— Цяпер надаецца вялікае значэнне студэнцкаму самакіраванню. Гэта вельмі сур'ёзнае пытанне, а на факультэце няма галоснасці аб ім: рэдка выпускаюцца газета «Эканаміст», «Камсамольскі пражэктар». Самакіраванне трэба пачынаць з камсамольскага друку.

**А. І. ІВАНЮК, дэкан факультэта павышэння кваліфікацыі:**

— Мы прад'яўляем асаблівыя патрабаванні да тых, хто чытае лекцыі для слухачоў ФПК. У цэлым думка іх аб нас добрая. Усе адзначалі высокі ўзровень лекцый прафесара С. А. Кіма, Л. С. Лазучэнкавай, Т. В. Карпей, Я. Я. Вяршыгары. Але ёсць шмат недахопаў у правядзенні практычных заняткаў.

**Л. С. ЛАЗУЧЭНКАВА, дацэнт кафедры галіновых эканомік:**

— Дзелавыя гульні — гэта неабходная частка вучэбнага працэсу. У нас жа на факультэце адносіны да дзелавых гульняў пасіўныя: на пятым курсе яны наогул не ўваходзяць у вучэбны план. Думаецца, кожны выкладчык павінен спрабаваць укараняць актыўныя метады працы са студэнтамі.

**М. У. АКУЛІЧ, дацэнт кафедры эканомікі працы, старшыня прафбюро:**

— Студэнтаў трэба вучыць асабістым прыкладам і добрасумленнымі адносінамі да працы. Я сам у 25 гадоў узначальваў атрад студэнтаў са 106 чалавек, якія асвойвалі казахстанскую цаліну. А чаму зараз мы баімся даверыць студэнтам самастойна рашаць якое-небудзь пытанне?

По абмеркаванаму пытанню на партыйным сходзе прынята разгорнутая пастанова. Яна абавязвае дэканат, партыйнае бюро, камітэт камсамола, загадчыкаў кафедр актывізаваць работу па павышэнню якасці вучэбнага працэсу, укараненню студэнцкага самакіравання ў адпаведнасці з патрабаваннямі аб перабудове вышэйшай школы.

Ад загадчыкаў кафедр запатрабавана ўзмацніць самастойную работу з адстаючымі студэнтамі.

Дэканату, камітэту камсамола, прафбюро студэнтаў, Савету студэнцкага самакіравання даручана да 1-га красавіка г. г. распрацаваць палажэнне аб заахвочванні акадэмічных груп, якія забяспечаць 100% паспяховасць, узорную дысцыпліну і актыўны ўдзел студэнтаў у грамадскім жыцці.

Перад метадычным саветам па нагляднай агітацыі пастаўлена задача забяспечыць шырокую галоснасць работы па самакіраванню, вучэбна-выхаваўчай і грамадска-палітычнай актыўнасці студэнтаў і супрацоўнікаў факультэта.

**А. МАЛАХАЎ,**
намеснік сакратара партбюро эканамічнага факультэта.



*ПРАЦУЕ ЖАНСАВЕТ*

## ПЕРШЫЯ КРОКІ

**Ініцыятыўныя, актыўныя выкладчыцы і супрацоўніцы універсітэта ўваходзяць у жансавет ГДУ. На адным з яго чарговых пасяджэнняў зацікаўлена абмяркоўваліся матэрыялы Усесаюзнай канферэнцыі жанчын, даклад, з якім выступіла на ім старшыня Камітэта савецкіх жанчын В. У. Церашкова. Асноўная думка канферэнцыі — савецкая жанчына павінна вызначыць сваё месца ў паскарэнні сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, у працэсе перабудовы, у вырашэнні вытворчых, сацыяльных, ідэйна-маральных задач — стала для жансавета універсітэта кіраўніцтвам да дзеяння.**

**НА ЗДЫМКУ** (злева направа) члены жансавета: асістэнт кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін Т. Ю. Гілеп, дацэнт кафедры педагогікі і псіхалогіі Г. Р. Гусева, ст. н. с. кафедры матэматычных праблем кіравання Г. У. Чарных, дацэнт кафедры гісторыі КПСС Т. І. Язэпава (старшыня), дацэнт кафедры фізічнай метралогіі Л. Х. Антропава, інжынер-матэматык ІВЦ А. А. Вішанкова.

Фота **Л. Акінчыц.**

# УСЁ МОГУЦЬ НАШЫ МАМЫ...

### З ВЫСТАЎКІ ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНЫХ І МАСТАЦКІХ РАБОТ

Пад такой назвай напярэдадні Міжнароднага жаночага дня — 8 Сакавіка жансавет універсітэта арганізаваў у першым вучэбным корпусе выстаўку дэкаратыўна-прыкладных і мастацкіх работ выкладчыц і супрацоўніц ГДУ. Прынялі ўдзел у выстаўцы таксама дзеці, маці якіх працуюць ва універсітэце.

Фантазія, майстэрства рук, натхненне... Усё гэта ў арганічным спалучэнні дало цудоўны вынік — прыгожыя вязаныя спіцамі і кручком рэчы: шалі, кофтачкі, абрусы, сурвэткі. Здзіўлялі сваёй арыгінальнасцю вышыўкі, макрамэ, а таксама кулінарныя сюрпрызы. Экспанатаў было шмат і кожны — цікавы і адметны па-свойму.

Так, сапраўды, усё могуць працавітыя жаночыя рукі. Праведзеная выстаўка стала гэтаму пацвярджэннем. У кнізе водгукаў з'явілася нямала цёплых і ўдзячных слоў у адрас арганізатара выстаўкі — жансавета, ўсіх яе ўдзельніц. Вось толькі адзін з такіх водгукаў: «...я ўбачыў сімвалічны вобраз жанчыны універсітэта — прыгожай, майстравой, гаспадарлівай, якая так адчувае ўсё прыгожае і ўмее яго цаніць...»

Наведвальнікі выстаўкі пакінулі ў кнізе водгукаў і нямала пажаданняў. Яны падказалі жансавету універсітэта новыя тэмы для выставак. Неабходна, каб у іх прымала ўдзел большая колькасць выкладчыц і супрацоўніц ГДУ.



**НА ЗДЫМКУ:** у час выстаўкі.

Фота **А. Ульянкінай.**

*70-годдзю Вялікага Кастрычніка — дастойную сустрэчу!*

**У АБЛВЫКАНКОМЕ, АБЛСАЎПРОФЕ, АБКОМЕ ЛКСМБ.**

# УМОВЫ АБЛАСНОГА САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА

## ЗА ПАВЕЛІЧЭННЕ ЎКЛАДУ КАЛЕКТЫВАЎ СТУДЭНЦКІХ АТРАДАЎ У ВЫКАНАННЕ ЗАДАННЯЎ XII ПЯЦІГОДКІ.

**Выканаўчы камітэт абласнога Савета народных дэпутатаў, прэзідыум абласнога савета прафсаюзаў, бюро абкома ЛКСМБ, надаючы важнае значэнне ролі студэнцкіх атрадаў у вырашэнні эканамічных і сацыяльных задач, якія вызначаны XXVII з'ездам КПСС, зацвердзілі ўмовы абласнога сацыялістычнага спаборніцтва за павелічэнне ўкладу калектываў студэнцкіх атрадаў у выкананне заданняў XII пяцігодкі.**

Абласное сацыялістычнае спаборніцтва за павелічэнне ўкладу калектываў студэнцкіх атрадаў у выкананне заданняў XII пяцігодкі арганізуецца сярод райкомаў, гаркомаў камсамола, якія ўдзельнічаюць у арганізацыі і правядзенні працоўнага семестра, занальных (раённых), зводных і лінейных студэнцкіх атрадаў вышэйшых, сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і прафесіянальна - тэхнічных вучылішчаў, якія працуюць на прадпрыемствах і ў арганізацыях вобласці.

Пераможцамі абласнога сацыялістычнага спаборніцтва прызнаюцца райкомы, гаркомы камсамола, якія ўдзельнічаюць у арганізацыі і правядзенні працоўнага семестра, занальныя (раённыя) атрады, зводныя і лінейныя атрады вышэйшых, сярэдніх устаноў і прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў, якія дабіліся лепшых вынікаў у выкананні прынятых сацыялістычных і дагаворных абавязацельстваў, дасягненні найвышэйшай прадукцыйнасці працы, уводзе аб'ектаў у эксплуатацыю своечасова і пры выдатнай якасці работ, шырокім укараненні перадавых метадаў арганізацыі працы, развіцці рацыяналізатарскай і вынаходніцкай дзейнасці, забеспячэнні высокай эфектыўнасці работ атрадаў небудаўнічага профілю, умацаванні працоўнай і фінансавай дысцыпліны, зацвярджэнні цвярозага ладу жыцця, захоўванні правілаў і норм аховы працы, высокага ўзроўню арганізацыі ідэйна-выхаваўчай і грамадска-палітычнай работы студэнцкай і навучэнцкай моладзі.

Падвядзенне вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва праводзіцца па катэгорыях:

райкомы, гаркомы камсамола, якія ўдзельнічаюць у арганізацыі і правядзенні працоўнага семестра;

занальныя (раённыя) студэнцкія атрады;

зводныя атрады вышэйшых навучальных устаноў;

зводныя атрады сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў I падгрупы (якія ўключаюць у свой састаў лінейныя атрады будаўнічага і небудаўнічага напрамку);

зводныя атрады сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў II падгрупы (якія ўключаюць у свой састаў лінейныя атрады небудаўнічага напрамку);

лінейныя студэнцкія атрады.

Пры наяўнасці грубых парушэнняў статута студэнцкага атрада, патрабаванняў фінансава-гаспадарчай дысцыпліны пытанне ўдзелу ў сацыялістычным спаборніцтве райкомаў, гаркомаў ЛКСМБ, занальных (раённых), зводных і лінейных студэнцкіх атрадаў вызначаецца сакратарыятам абкома ЛКСМ Беларусі.

Раённы, гарадскі камітэт ЛКСМБ, які заняў першае месца, узнагароджваецца пераходным вымпелам абласнога Савета народных дэпутатаў, аблсаўпрофа і абкома ЛКСМБ.

Раённы, гарадскі камітэты ЛКСМБ, якія занялі другое і трэцяе месцы, узнагароджваюцца Ганаровымі граматамі абкома ЛКСМБ.

Занальны (раённы) студэнцкі атрад, які заняў першае месца, узнагароджваецца пераходным вымпелам абласнога Савета народных дэпутатаў, аблсаўпрофа, абкома ЛКСМБ.

Занальны (раённы) студэнцкі атрад, які заняў другое месца, узнагароджваецца пераходным вымпелам аблсаўпрофа, абкома ЛКСМБ.

Занальны (раённы) студэнцкі атрад, які заняў трэцяе месца, узнагароджваецца Ганаровай граматай абкома ЛКСМБ.

Зводны студэнцкі атрад вышэйшай навучальнай установы, які заняў першае месца, узнагароджваецца Чырвоным сцягам і дыпломам абласнога Савета народных дэпутатаў, аблсаўпрофа, абкома ЛКСМБ і грашовай прэміяй у 1000 рублёў.

Зводны студэнцкі атрад вышэйшай навучальнай установы, які заняў другое месца, узнагароджваецца пераходным вымпелам аблсаўпрофа і абкома ЛКСМБ і грашовай прэміяй у 500 рублёў.

Зводны студэнцкі атрад вышэйшай навучальнай установы, які заняў трэцяе месца, узнагароджваецца Ганаровай граматай абкома ЛКСМБ і грашовай прэміяй у 250 рублёў.

Зводныя студэнцкія атрады сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў, якія занялі першыя месцы па I і II падгрупе, узнагароджваюцца пераходным Чырвоным сцягам і дыпломамі абласнога Савета народных дэпутатаў, аблсаўпрофа і абкома ЛКСМБ і грашовымі прэміямі па 400 рублёў кожны.

Зводныя студэнцкія атрады сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў, якія занялі другія месцы па I і II падгрупе, узнагароджваюцца пераходнымі вымпеламі аблсаўпрофа і абкома ЛКСМБ і грашовымі прэміямі па 200 рублёў кожны.

Зводныя студэнцкія атрады сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў, якія занялі трэція месцы ў I і II падгрупе, узнагароджваюцца Ганаровымі граматамі абкома ЛКСМБ і грашовымі прэміямі па 100 рублёў кожны.

26 лінейных студэнцкіх атрадаў, якія дасягнулі лепшых вынікаў па асобных напрамках вытворчай і грамадска-палітычнай работы, прадстаўляюцца да ўзнагароджвання Ганаровымі граматамі аблсаўпрофа, абкома ЛКСМБ, аддзелаў і ўпраўленняў аблвыканкома, гаспадарчых і грамадскіх арганізацый.

Райкомы, гаркомы камсамола, занальныя (раённыя), зводныя і лінейныя студэнцкія атрады — пераможцы абласнога сацыялістычнага спаборніцтва заносяцца ў кнігу Гонару абласной камсамольскай арганізацыі. Удзельнікі і арганізатары працоўнага семестра прадстаўляюцца штабам студэнцкіх атрадаў да ўзнагарод ЦК ВЛКСМ, ЦК ЛКСМБ, абкома ЛКСМБ, абласных гаспадарчых і грамадскіх арганізацый.

## ЖУК Антон Усцінавіч



На 44-м годзе жыцця заўчасна памёр дацэнт кафедры аналізу гаспадарчай дзейнасці Антон Усцінавіч Жук. Перастала біцца сэрца выключна сціплага і добразычлівага чалавека.

А. У. Жук нарадзіўся 29 студзеня 1944 года ў вёсцы Заруддзе Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і селяніна. Па заканчэнні сярэдняй школы ён працаваў рабочым у адной з будаўнічых арганізацый г. Мінска. Затым вучыўся ў Беларускім дзяржаўным інстытуце народнай гаспадаркі імя В. В. Куйбышава, які закончыў з адзнакай у 1969 годзе. Пасля размеркавання тут жа працаваў асістэнтам кафедры статыстыкі, а затым вучыўся ў аспірантуры.

З кастрычніка 1973 года і да апошніх дзён жыцця ўся працоўная дзейнасць А. У. Жука была звязана з эканамічным факультэтам нашага універсітэта. Тут ён прайшоў шлях ад выкладчыка да дацэнта, на працягу пяці гадоў загадваў кафедрай уліку і статыстыкі.

А. У. Жук вызначаўся высокім узроўнем прафесіянальнай падрыхтоўкі, добрасумленнымі, творчымі адносінамі да выкладання вучэбных дысцыплін, выканання грамадскіх даручэнняў, актыўна ўдзельнічаў у навукова-даследчай рабоце. Ён — аўтар больш 30 навуковых прац, у тым ліку манаграфіі, некалькіх вучэбных і метадычных дапаможнікаў, з'яўляўся членам рэспубліканскай статыстычнай секцыі навукова-эканамічнага таварыства.

Антон Усцінавіч Жук карыстаўся аўтарытэтам сярод выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў. Светлая памяць аб ім надоўга захаваецца ў сэрцах тых, каму ён шчодра перадаваў свае веды, з кім побач працаваў.

**Група таварышаў.**

# У ПАДАРОЖЖА ПА ЧАТЫРОХ КРАІНАХ

Слаўныя традыцыі мае студэнцкі патрыятычны рух. Рукамі будучых маладых спецыялістаў штогод асвойваюцца многія сотні мільёнаў рублёў капіталаўкладанняў. Узводзяцца новыя аб'екты прамысловага, сельскагаспадарчага і культурна-бытавога прызначэння. Юнакі і дзяўчаты студэнцкіх атрадаў знаходзяць прымяненне сваім сілам і ўменням і ў іншых сферах народнай гаспадаркі. Працавітасць, стараннасць маладых заслугоўвае высокую ацэнку. Для самых лепшых з іх штогод арганізуюцца цікавыя падарожжы. Як правіла, сярод савецкіх турыстаў — і студэнты нашага універсітэта.

Чацвёра студэнтаў ГДУ адправіліся ў захапляючае падарожжа гэтымі днямі. Сярод іх — Анатоль Мележ. Пасля службы ў радах Савецкай Арміі ён паступіў на падрыхтоўчае аддзяленне універсітэта і цяпер ужо студэнт трэцяга курса аддзялення арганізацыі механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі. Анатоль — сапраўдны актывіст студэнцкага будаўнічага руху. Летась у саставе атрада «Эканаміст» ён працаваў у саўгасе «Вялікаборскі» Хойніцкага раёна на ўзвядзенні жылых дамоў для эвакуіраваных з зоны, пацярпеўшай ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Вялікім аўтарытэтам на матэматычным факультэце карыстаецца чацвёртакурсніца Алена Гаўрылавец. Яна — член камітэта камсамола матфака, узначальвае факультэцкі штаб працоўных спраў, зарэкамендавала сябе не толькі як добры арганізатар, але і старанны работнік. У бягучым навучальным годзе Алена з пачуццём камсамольскага абавязку адклікнулася на просьбу паехаць у Хойніцкае СПТВ, дзе выкладала матэматыку і інфарматыку.

У мінулым працоўным семестры камандзірам атрада «Верас», які стаў адным з пераможцаў універсітэцкага сацыялістычнага спаборніцтва, была студэнтка фізічнага факультэта, цяпер ужо чацвёртакурсніца, Галіна Янучок. Два сезоны запар з'яўлялася камісарам авіяатрада бортправаднiц «Пралескі» трэцякурсніца эканамічнага факультэта Алена Балога. Сёлета яна стала камандзірам гэтага атрада.

Усе названыя студэнты універсітэта за плённую працу ў летніх семестрах узнагароджваліся граматамі гаркома і абкома ЛКСМБ. На гэты раз яны заслужылі права быць удзельнікамі падарожжа па краінах Сярэднеземнамор'я — Марока, Мальта, Іспанія і Грэцыя. З гэтымі краінамі азнаёмяцца яшчэ восем студэнтаў ВНУ Гомельшчыны.

**Б. ПАЎЛОВІЧ.**

*У заалагічным гуртку*

# ЗНАЁМСТВА З ІНДЫЯЙ

Цікавае «падарожжа» па Індыі зрабілі разам з прафесарам Б. П. Савіцкім студэнты і супрацоўнікі біялагічнага факультэта на апошнім пасяджэнні заалагічнага гуртка. Сам Барыс Парфёнавіч у саставе турысцкай групы нядаўна пабываў у гэтай краіне, яе сталіцы — Дэлі, у гарадах Бамбей, Агры, Джайпуры. З захапляючай паездкі ён прывёз вялікую колькасць слайдаў, фотаздымкаў, уражанняў не толькі аб помніках архітэктуры і мастацтва Індыі, але і аб быце, жыцці гэтага народа, сельскай гаспадарцы, раслінным і жывёльным свеце далёкай дружалюбнай краіны.

З цікавасцю слухалі студэнты, члены заалагічнага гуртка, супрацоўнікі і выкладчыкі біяфака захапляючы расказ аб падарожжы на дарогах Індыі, рабоце індыйскага ўрада па ахове прыроды, прынятым у 1972 годзе сусветна вядомым праекце «Тыгр», мэтай якога з'яўляецца не толькі ахова гэтай унікальнай жывёлы, але і захаванне месцаў яго пражывання. Цяпер работы па ахове жывёльнага і расліннага свету Індыі фінансуюцца ўрадам і ажыццяўляюцца ў 11 рэзерватах (запаведніках) плошчай 15,8 тыс. $км^2$, што складае 0,49% тэрыторыі краіны. Прынятыя меры ўжо даюць пэўныя вынікі. Колькасць таго ж тыгра ў апошні час значна павялічылася.

Не менш цікава было пачуць прысутным і аб жывёлах, якія жывуць у Індыі. На вуліцах, у садах і парках часта можна сустрэць розныя віды малпаў, а таксама мангустаў, бурундукоў. З птушак найбольш распаўсюджаны індыйскія шпакі — майны, зялёныя папугаі, шчуркі. На палях, у прыдарожных хмызняках сустракаюцца нават дзікія паўліны, а ў парках, садах шмат буйных, дэкаратыўных матылькоў рознай афарбоўкі і велічыні. Усё гэта — вынік традыцыйна ашчадных адносін насельніцтва да навакольнага асяроддзя. Індус, нават дзіця, ніколі без патрэбы не сарве кветку, не заб'е жывёліну, насякомае. Апошняга, па меры магчымасці, нават вадзіцелі аб'едуць.

Яшчэ шмат аб чым расказаў прафесар Б. П. Савіцкі: аб сустрэчах на індыйскай зямлі, добразычлівых адносінах яе жыхароў да нашай краіны і савецкага народа. Расказ суправаджаўся дэманстрацыяй каляровых слайдаў і фотаздымкаў, выклікаў шмат пытанняў.

**Я. ПАДУТАЎ,**
**дацэнт кафедры заалогіі і аховы прыроды.**



ПРОВАДЫ ЗІМЫ. Фота У. Чысціка.

## ЛЕКЦЫЯ ВУЧОНАГА

На мінулым тыдні выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта сустрэліся з доктарам філасофскіх навук, прафесарам Мінскай вышэйшай партыйнай школы, лектарам рэспубліканскага таварыства «Веды» А. Я. Міхневічам. Ён выступіў з лекцыяй «Аб культуры мыслення», у якой закраналіся праблемы перабудовы свядомасці, мыслення савецкіх людзей у святле ўсіх патрабаванняў апошніх пастаноў партыі, урада, ролі чалавечага фактару ў рашэнні задач сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

**В. СТАРАКОЖАВА,**
**адказны сакратар універсітэцкай арганізацыі таварыства «Веды»**

## НА АРГАНІЗАЦЫЙНЫМ ПАСЯДЖЭННІ

На сходзе працоўнага калектыву універсітэта, які адбыўся 19-га лютага, выбраны новы састаў камісіі ГДУ па барацьбе з п'янствам і алкагалізмам. На першым арганізацыйным пасяджэнні членаў камісіі яе старшынёй абраны загадчык кафедры ўсеагульнай гісторыі Р. Р. Лазько, намеснікам старшыні — загадчык кафедры батанікі і фізіялогіі раслін дацэнт Л. М. Сапегін, сакратаром — загадчыца універсітэцкай бібліятэкі В. М. Касцючэнкава.

У сваёй рабоце камісія кіруецца Палажэннем аб камісіях па барацьбе з п'янствам, якія ўтвараюцца на прадпрыемствах, ва ўстановах, арганізацыях і ў іх структурных падраздзяленнях.

## ВЫБРАНЫ НОВЫ СТАРШЫНЯ

Адбылося пасяджэнне Савета універсітэцкай арганізацыі Беларускага рэспубліканскага таварыства барацьбы за цвярозасць. На ім разгледжана арганізацыйнае пытанне. У сувязі з пераводам загадчыка кафедры ГА і медпадрыхтоўкі дацэнта В. П. Дзядзічкіна на пасаду старшага навуковага супрацоўніка для завяршэння работы над доктарскай дысертацыяй ён вызвалены ад абавязкаў старшыні Савета універсітэцкай арганізацыі барацьбы за цвярозасць. Новым яе старшынёй абраны дацэнт кафедры фізічнага выхавання кандыдат педагагічных навук В. А. Мядзведзеў.

*Востры сігнал*

## «ЧАМУ МЫ НЕ МОЖАМ ПААБЕДАЦЬ?»

У рэдакцыю шматтыражнай газеты паступіла скарга студэнтаў груп 0-41 і 0-42 эканамічнага факультэта аб дрэннай рабоце буфета ў галоўным корпусе. **«Вось ужо некалькі месяцаў, —** пішуць 32 студэнты, **— мы не можам нармальна паабедаць ці нават перакусіць. Буфет працуе не па графіку. У 12 гадзін ён яшчэ закрыты, прадукты не атрыманы, а ў 14 гадзін тут ужо няма чаго есці, таму што прадукты завозяцца ў недастатковай колькасці (часам яны і недабраякасныя).»**

На гэтыя ўзнятыя студэнтамі эканомфака пытанні грамадскага харчавання рэдакцыя газеты чакае пісьмовага адказу ад дырэкцыі сталовай № 40.

## НА КНІЖНАЙ ПАЛІЦЫ

### ТВОРЫ КЛАСІКАЎ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

**Янка КУПАЛА: Энцыклапедычны даведнік.** Мн.: БелСЭ, 1986 г.

«Янка Купала» — першая на Беларусі персанальная энцыклапедыя. Яна асвятляе асноўныя моманты жыцця і творчасці народнага паэта, уключае праблемныя артыкулы пра творчасць Я. Купалы, яго лірыку, драматургію, публіцыстыку, паасобныя жанры, вобразы, расказвае пра сувязі паэта з рускай літаратурай, літаратурамі народаў СССР і замежных краін, пра ўвасабленне купалаўскай тэмы ў выяўленчым мастацтве, музыцы, тэатры, кіно.

**КУПАЛА Я. А хто там ідзе!** На мовах свету. Мн.: Мастацкая літаратура, 1983 г.

Славуты верш народнага паэта Беларусі выдаецца асобнай кнігай у перакладзе на восемдзесят дзве мовы свету.

**КОЛАС Я. Новая зямля. Сымон-музыка. Паэмы.** Мн.: Мастацкая літаратура, 1986.

Паэма «Новая зямля» — класічны твор нацыянальнай літаратуры, у якім глыбока адлюстраваны сацыяльныя супярэчнасці беларускай вёскі канца XIX ст.

У паэме «Сымон-музыка» сцвярджаецца неперамажнасць народнага мастацтва як сведчанне духоўнай сілы народа.

**КОЛАС Я. На прасторах жыцця. Аповесць, апавяданні, казкі.** Мн.: Юнацтва, 1986 г.

Названыя вышэй кнігі вы можаце набыць у кнігарні № 19. (Савецкая, 106).

**М. ДЗЯТЛАВА,**
**прадавец магазіна.**

СПОРТ

## САЛОДКІЯ... УЗНАГАРОДЫ

1-га сакавіка ў нашым горадзе праводзіліся традыцыйныя провады зімы. На іх сабралася шмат гамяльчан, якія з цікавасцю сачылі за разнастайнымі прадстаўленнямі.

Пры вялікай колькасці ўдзельнікаў праходзіў адначасова і Усесаюзны дзень лыжніка. Студэнты нашага універсітэта сабраліся ў сваім парку. Каля помніка змагарам за народнае шчасце адбылося пастраенне. Перад удзельнікамі спаборніцтваў выступіў сакратар камітэта ЛКСМБ Алег Дземідзенка. Ён пажадаў студэнтам быць дастойнымі тых, хто аддаў сваё жыццё за наш сённяшні шчаслівы час, поспехаў у вучобе, высокіх вынікаў на лыжні.

Дзяўчаты мераліся сіламі на дыстанцыі 3 км, мужчыны — 5 км. Пераможцамі сталі адпаведна пяцікурсніца біялагічнага факультэта Зінаіда Скачкова і слухач падрыхтоўчага аддзялення спецыяльнасці «Біялогія» Уладзімір Біжукоў. Ад спартыўнага клуба яны былі ўзнагароджаны тартамі, ад камітэта камсамола — граматамі і сувенірамі.

(Наш кар.)

## ПРАВЕРЫЛА ЛЫЖНЯ

Наступіў першы вясновы месяц. І лыжнікі нашага універсітэта не ўпусцілі час, каб выявіць мацнейшых у індывідуальным і камандным заліках па праграме універсіяды. Спаборніцтвы прайшлі ў мінулую сераду ў паркавай зоне за Сожам.

На старт выйшла 96 чалавек ад усіх факультэтаў. Дзяўчаты спаборнічалі на 5-кіламетровай дыстанцыі. Лепшы вынік паказала пяцікурсніца біялагічнага факультэта Зінаіда Скачкова. Другой была Паліна Андрасюк з факультэта фізвыхавання. Трэцяе месца з аднолькавым вынікам падзялілі Іна Дубкова з гісторыка-філалагічнага і Антаніна Чубрыкава з матэматычнага факультэта.

Юнакі памераліся майстэрствам на дыстанцыі ўдвая даўжэйшай. Па-за канкурэнцыяй аказаліся спартсмены факультэта фізвыхавання. Ім дасталіся ўсе прызавыя месцы. Лепшы вынік паказаў Валянцін Драчоў. Наступныя — адпаведна П. Еўдакімаў і І. Кукобнікаў.

У агульнакамандным заліку першынство ўпэўнена заваявалі лыжнікі факультэта фізвыхавання. Яны набралі 5380 ачкоў і значна апярэдзілі будучых матэматыкаў (3913).

Больш напружанай была барацьба за трэцяе прызавое месца. Усяго толькі на 7 ачкоў студэнты-геолагі апярэдзілі будучых біёлагаў.

Пяты вынік у камандным заліку паказалі лыжнікі гісторыка-філалагічнага факультэта, шосты — фізічнага. Слабей звычайнага выступіла каманда эканамічнага факультэта. Яна заняла апошняе месца і набрала ўсяго толькі 1907 ачкоў.

**Л. МАРОЗАВА,**
**галоўны суддзя спаборніцтваў.**



**НА ЗДЫМКУ: на дыстанцыі — дзяўчаты.** Фота А. Ульянкіной.

## ЧЫРВОНЫ СВЯТЛАФОР

ПАД ТАКІМ загалоўкам мы змяшчаем на старонках шматтыражнай газеты прозвішчы тых студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта, якія парушылі правілы дарожнага руху. Няхай сорамна будзе ім за сваю нявыхаванасць, неарганізаванасць, за тое, што ствараючы сваімі паводзінамі аварыйныя сітуацыі на дарогах, яны рызыкуюць не толькі сваім, але і жыццём многіх іншых людзей.

За апошнія два месяцы супрацоўнікамі міліцыі аштрафавана за парушэнне правілаў дарожнага руху дзевяць студэнтаў і адзін супрацоўнік ГДУ. Гэта Т. Козел і І. Марцынішына (гістфіл), А. Байкоў, В. Маісееў (эканомфак), В. Малчанаў, А. Багданаў (фізфак), Я. Палякоў, Т. Тапарова (матфак), Г. Петрушэнка (факультэт фізвыхавання), старшы інжынер ПНДЛ Л. Грубер.

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, кафедры, увесь калектыў выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў эканамічнага факультэта глыбока смуткуюць з выпадку заўчаснай смерці дацэнта кафедры аналізу гаспадарчай дзейнасці ЖУКА Антона Усцінавіча і выказваюць сваё спачуванне яго родным і блізкім.**

А354089

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 57-16-52.